А. М. Шугаеў

# Эстэтычнае выхаванне студэнтаў сродкамі беларускага фальклору

*(вопыт работы народнага ансамбля беларускай музыкі і песні «Ярыца»)*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

*А. М. Шугаеў*

# ЭСТЭТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ СТУДЭНТАЎ СРОДКАМІ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ

## *(вопыт работы народнага ансамбля беларускай музыкі і песні «Ярыца»)*

*Вучэбны дапаможнік з нотным дадаткам*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінск,
БДПУ
2018

УДК 378.091.2(075.8)
ББК 74.58я73
Э87

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ,
рэкамендавана секцыяй педагагічных навук (пратакол № 9 ад 24.04.2018 г.)

Складальнік:
*А. М. Шугаеў, дацэнт кафедры музычна-педагагічнай адукацыі БДПУ*

Рэцэнзенты:
*Н. В. Чэрнікава*, кандыдат педагагічных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры педагогікі БДПУ ;
*Н. Г. Мазурына*, кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры тэорыі і методыкі выкладання мастацтва БДПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Эстэтычнае** выхаванне студэнтаў сродкамі беларускага фальклору (вопыт работы
Э87 народнага ансамбля беларускай музыкі і песні «Ярыца») : вучэбны дапаможнік з нотным дадаткам / склад. А. М. Шугаеў. – Мінск : БДПУ, 2018. – 76 с.

ISBN 978-985-541-530-6.

У вучэбным дапаможніку адлюстраваны метадычны і практычны вопыт работы народнага ансамбля беларускай музыкі і песні «Ярыца», вядучага творчага калектыву Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка. Прадстаўлены нотны матэрыял твораў з рэпертуара ансамбля.

Адрасуецца кіраўнікам творчых калектываў, выкладчыкам і студэнтам, усім тым, хто цікавіцца фальклорнай спадчынай, беларускай народнай музыкай і пытаннямі эстэтычнага выхавання сродкамі фальклору.

**УДК 378.091.2(075.8)**
**ББК 74.58я73**

**ISBN 978-985-541-530-6**

© Шугаеў А. М., складанне, 2018
© Афармленне. БДПУ, 2018

# Уступ

Захаванне самабытнай нацыянальнай культуры для Беларусі з'яўляецца адной з важнейшых умоў незалежнага існавання. Таму на сучасным этапе надаецца вялікае значэнне эстэтычнаму выхаванню моладзі. Перад установамі вышэйшай адукацыі Беларусі стаіць мэта фарміравання ўсебакова развітай асобы, якая валодае творчым мысленнем і мастацкай культурай. Фарміраванне прафесійных якасцяў студэнтаў павінна быць цесна звязана з эстэтычным выхаваннем. І ў гэтым вялікае значэнне мае захаванне традыцый нацыянальнага выхавання і перадача іх наступным пакаленням. Далучэнне моладзі да фальклорнага мастацтва выхоўвае ў іх талерантнасць да іншых культур, уменне бачыць і цаніць прыгажосць навокал і каштоўнасць у розных творах мастацтва. Фарміраванне полікультурнай асобы павінна праходзіць на падставе агульначалавечых каштоўнасцяў – любові і павагі да Радзімы, культуры, фальклору, звычаяў і традыцыяў Беларусі.

У дадзеным вучэбным дапаможніку разглядаюцца асноўныя накірункі эстэтычнага выхавання студэнтаў сродкамі беларускага фальклору на прыкладзе работы Народнага ансамбля беларускай музыкі і песні «Ярыца» Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка. Выканальніцкае майстэрства гэтага калектыву адрозніваецца высокім узроўнем і самабытнасцю. Праз творчую дзейнасць у калектыве маладыя людзі становяцца захавальнікамі, выканаўцамі і інтэрпрэтатарамі музычнага мастацтва беларускага народа. Работа ансамбля не абмяжоўваецца толькі творчай дзейнасцю, рэпетыцыямі, канцэртамі. Гэта вельмі важны элемент вучэбна-выхаваўчага працэсу факультэта эстэтычнай адукацыі, сродак фарміравання і развіцця мастацка-эстэтычнага патэнцыялу асобы. Пад час заняткаў у ансамблі ў студэнтаў фарміруецца актыўная жыццёвая пазіцыя, здольнасці да бесперапыннай самаадукацыі і самаўдасканалення, імкненне да прыгажосці, дабрыні і творчых адносін да жыцця. Пасля заканчэння вучобы ў БДПУ выпускнікі ансамбля маюць магчымасць працаваць у дзіцячых самадзейных калектывах, ва ўстановах дадатковай адукацыі і перадаваць свае веды, уменні, любоў і павагу да народнай культуры маладому пакаленню.



Эстэтычнае і полікультурнае выхаванне студэнтаў з'яўляецца вельмі своечасовым, паколькі фарміруе патрэбнасць зносін з мастацтвам на працягу наступнага дарослага жыцця.

Заняткі фальклорам далучаюць студэнтаў да шэдэўраў народнай і акадэмічнай музыкі Беларусі і іншых краін. Студэнты пад час рэпетыцый павышаюць свае прафесійныя магчымасці: яны займаюцца вакалам, інструментальным выканальніцтвам, вучацца разумець выразныя сродкі музычнай мовы. Разам з тым яны духоўна ўзбагачаюцца, зносіны з музыкай садзейнічаюць фарміраванню іх музычнай культуры. Вывучэнне беларускай народнай музыкі і нацыянальных музычных традыцый аказвае вялікі ўплыў на фарміраванне духоўнасці і выхаванне ў будучых настаўнікаў грамадзянкасці і патрыятызму.



Міжнародны фестываль «Народныя калядкі» ў г. Брусы (Польшча, 2014 г.)

Мастацкі калектыў – адна з самых дзейсных форм эстэтычнага выхавання. Заняткі ў калектыве пашыраюць кругагляд, развіваюць творчыя здольнасці, садзейнічаюць далучэнню да мастацтва (як народнага, так і прафесійнага), фарміраванню ўпэўненасці, а таксама навыкаў калектыўнага ўзаемадзеяння і творчасці. Фальклорны ансамбль аднаўляе гістарычныя і культурныя сувязі, дае магчымасць зразумець і вывучыць традыцыі і звычаі продкаў. У мэтах эстэтычнага выхавання ствараюцца ўмовы для рэалізацыі творчых здольнасцей студэнтаў: студэнты знаёмяцца з рознымі жанрамі народнай творчасці, удасканальваюць прафесійныя вакальна- і інструментальна-выканальніцкія навыкі, актыўна ўдзельнічаюць у традыцыйных народных святах і абрадах.

*Старшы выкладчык кафедры тэорыі
і методыкі выкладання мастацтва БДПУ
М. А. Шатарава*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ